Шлях Моладзі

Šlach Moładzi

...„Падыймайся з нізін, сакаліна сям'я,
Над крыжамі бацькоў, над нягодамі!
Занімай, Беларусь маладая мая,
Свой пачэсны пасад між народамі."

ЯНКА КУПАЛА.



№ 11 (110) Vilnia, 1 Kastryčnika 1937 h. Hod IX.

UVAHA! NOVAŚĆ! UVAHA!

Cennyja premii dla akuratnych padpiščykaŭ „Šlachu Moładzi"!

Niabyvałaja akazija zusim darma vyjhrać hadzińnik, sekatar, nažy da ščapleńnia dreŭ, cennyja knižki i inš. rečy.

Administracyja „šlachu Moładzi" pastanaviła sioleta vosieńniu raździalić miž akuratnych svaich padpiščykaŭ premii za ichniuju dbajnaść. Premii buduć padzieleny darohaj losavańnia, da jakoha buduć dapuščany tolki tyja padpiščyki, katoryja apłacili, abo jašče apłaciać padpisku na „šlach Moładzi" za hety sioletni 1937 h. (usiaho tolki dva złotyja).

Śpis hałaŭniejšych premijaŭ:

1. Dobry hadzińnik na ruku.
2. Sekatar (nožnicy da abrazańnia halinak dreŭ).
3. 2 nažy da ščapleńnia dreŭ.
4. „Гісторыя (Беларускай) Крыўскай Кнігі" В. Ластоўскага, якая ў прадажы каштуе 10 зл.
5. „Пчолы" — кніга аб пчалаводзтве Пачопкі.
6. „Гісторыя Беларускай Літаратуры" М. Гарэцкага.
7. „Географія Беларусі" Смоліча.
8. „Хрыстаматыя Беларускай літаратуры" Дварчаніна.
9. Hramafonnaja plitka z biełaruskim narodnym tancam «Lavonicha» i z pieśniaj „A u lesie, lesie" ŭ vykanańni słaŭnaha tenara M. Zabejdy-Sumickaha.
10. Partret biełaruskaha paeta M. Bahdanoviča.

Dyk chto choča być u liku dapuščanych da losavańnia premijaŭ, niachaj zaraz pastarajecca apłacić padpisku. Chto-ž padpiski nie apłacić, toj nia budzie pryjmać udziełu ŭ losavańni i tamu vysyłka „Šlachu Moładzi" budzie strymana!

Treba pamiatać, što svaja presa, svaje časapisy, najlepš baroniać i infarmujuć. Tamu, biełarusy pavinny padtrymlivać svaju presu i pašyrać jaje, zdabyvajučy novych padpiščykaŭ. Biełaruskaja moładź pavinna pieradusim vypisvać i pašyrać „ŠLACH MOŁADZI"!

Administracyja „Šlachu Moładzi."

„Шлях Моладзі"

ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЕ МОЛАДЗІ.

Выходзіць: 1-га і 15-га кожнага месяца.

Падпіска на 1 месяц 30 гр.; на 3 месяцы 75 гр., на паўгода—1.50 зл., на цэлы год — 2 зл. і 50 гр.
Заграніцу—ўдвая даражэй.

ЦЭНЫ АБВЕСТАК: 1/1 бачына 50 зл., 1/2—25 зл., 1/4—15 зл., 1/8—8 зл.

Адрыс Рэдакцыі: Вільня (Wilno), Завальная вуліца № 1—2. [(ul. Zawalna 1—2).
№ kartateki przekaz. razachnk. 59.

Шлях Моладзі

ІЛЮСТРАВАНЫ ЧАСАПІС БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

Год IX. Вільня, 1 Кастрычніка 1937 г. №11 (110).

Міхась Машара

Дарога

Дарога —
вялікіх прастораў дарога,
саджоным гасьцінцам лягла праз палі,
ідуць па ей —
людзі, туга і трывога
і песьню шумяць тапалі.

З шырокіх прастораў —
вандруючым шляхам,
здаўна тут гуляюць на полі вятры
і сыплюцца зоры чырвоныя макам —
праз сіта начное цямры.

Калёсы скрыпяць і паўзуць каляінай
і шэпчуць калосься,
кусты
і трава,
часамі запахне ў прасторы бэнзінам —
дзе сум развавжае вярба.

Таптаныя сьцежкі —
і тропы-дарожкі,
як косы з гасьцінца у далі бягуць;
у далі глухія —
дзе дзікім гарошкам
і гора,
і сьлёзы — цьвітуць.

Таболы, верасень 1937 г.



Usie na kulturna-aśvietny front!

Žyćcio i praca na biełaruskaj adradženskaj nivie pakazali, što tam, dzie ludzi cikaviacca knižkaj i hazetaj, tam dzie jdzie kulturnaja praca, — tam abstaviny žyćciovyja stanoviacca lehčejšymi, žyćcio bolš kulturnym i nacyjanalnaja śviedamaść pašyrajecca. I naadvarot, tam dzie ciemra, tam ludzi nia mohuć vyjavić chto jany, stydajucca svajho nacyjanalnaha abličča, sami siabie, i žyćcia svajho nijak nia mohuć padniać na vyšejšy ŭzrovień. Biaručy heta pad uvahu, biełaruskija arhanizacyi, biełaruskija dziejačy i pravadyry biełaruskaha adradženskaha ruchu kłali vialiki nacisk na kulturnuju i aśvietnuju pracu. Sam narod, śviedamyja biełaruskija masy achvotna padtrymlivali kožny kulturny pačyn, damahajučysia rodnych škołaŭ, nia hledziačy na toje, jak henyja damahańni byli spatykanyja i realizavanyja haspadarstviennymi (dziaržaŭnymi) ŭładami.

Apošnim časam biełaruskaja kulturna-aśvietnaja praca, z pryčyny likvidacyi biełaruskich kulturnych arhanizacyjaŭ, apynułasia ŭ asabliva ciažkich abstavinach. Dziela hetaha spravaj hetaj zaniaŭsia Biełaruski Nacyjanalny Kamitet ŭ Vilni, na specyjalna sklikanym 14-ha vieraśnia ahulnym i nadzvyčajnym schodzie, jaki

„...razhledziŭšy sučasnaje pałažeńnie biełaruskaje aśviety ŭ hranicach Polskaje Dziaržavy, śćviardžaje nastupnaje.

1. Biełaruskaja narodnaja aśvieta pradstaŭlajecca hetak:

   a) pačatkavaje navučańnie biełaruskich dziaciej ŭ dziaržaŭnych škołach pravodzicca papolsku,

   b) adzinaja ŭ krai siaredniaja biełaruskaja škoła — Biełaruskaja Filja dziaržaŭnaje himnazii im. Jul. Słavackaha ŭ Vilni nia moža zdavolić patreby biełarusaŭ u halinie narodnaje aśviety.

2. Biełarusy damahajucca navučańnia svaich dziaciej u rodnaj movie:

   a) dziela pačatkavaha školnaha navučańnia padajuć školnym uładam deklaracyi za biełaruskuju škołu,

   b) dziela navučańnia ŭ himnazijach i licejach prosiać dziaržaŭnyja ŭłady adčynić adpaviedny lik hetych škołaŭ i roŭnaležnyja klasy pry škołach isnujučych, a tak-ža robiać zachady dziela adčynieńnia pryvatnych himnazijaŭ i licejaŭ.

3. Niedastatak metodyčnaha navučańnia školnaha biełaruskija narodnyja masy dapaŭniajuć samaaśvietaju, kultyvujučy biełaruskaje słova, pieśniu i zvyčai, a tak-ža cikaviačysia zdabytkami i padziejami va ŭsim śviecie.

4. Ahulny schod Biełaruskaha Nacyjanalnaha Kamitetu śćviardžaje tak-ža, što biełaruskaja moładź (u vializarnaj bolšaści) na šlachu zdabyvańnia vyšejšaj aśviety spatykajecca z niepakanalnymi pieraškodami mataryjalnaha charaktaru.

Biaručy pad uvahu vyšejskazanaje, Biełaruski Nacyjanalny Kamitet zaklikaje ŭsio biełaruskaje hramadzianstva dalej:

1. Usimi sposabami damahacca dla dziaciej svaich *biełaruskich* pačatkavych škołaŭ,

2. U spravie siaredniaha školnictva-pradstaŭlać i dalej adnosnym uładam Polskaje Dziaržavy patreby hetaha školnictva, z damahańniem adčynieńnia hetych škołaŭ na košt dziaržavy, a tak-ža prystupać da arhanizavańnia pryvatnych biełaruskich himnazijaŭ i licejaŭ.

3. U halinie zaškolnaj aśviety — naładzić fachovuju pomač u samaadukacyi šyrokich biełaruskich masaŭ.

4. Dziela padtrymańnia niezamožnaj ale zdolnaj biełaruskaj moładzi vyšejšych, siarednich i prafesyjanalnych škołaŭ naładzić supolnuju šyrokuju akcyju źbirańnia mataryjalnaj dapamohi."

Jak bačym, Biełaruski Nacyjanalny Kamitet spravu biełaruskaje aśviety razhledzieŭ usiebakova i pakazaŭ šlachi dziela zdabyvańnia jaje. Važnaja hetaja sprava, i zaklik pavinien znajści šyrokaje padtrymańnie. Za kulturnuju pracu, za samaaśvietu pavinna ŭziacca pieradusim moładź, asabliva ciapier uvosieni i zimoj, paśla zakančeńnia palavych rabot, u doŭhija viečary, katoryja časta prachodziać biezvartasna pry kartach i pustych hutarkach. Ale kulturnaja praca patrebnaja nia tolki dla moładzi, za jaje treba bracca i pravodzić usim, i ŭsie, jak adzin, pavinny vystupić na kulturna-aśvietny biełaruski front, dy supolnymi siłami zdabyvać lepšuju budučyniu!...

Важнае для беларускае сялянскае моладзі!

Ня раз мы ўжо пісалі, што беларускай моладзі, сыном сялянскага народу, сыном земляробаў, трэба класьці вялікі націск на здабываньне асьветы з галіны земляробскай. У цяперашніх аднак варунках, з прычыны нястачы адпаведных і у належнай колькасьці земляробскіх школаў, рабіць гэта цяжка. Дзеля таго трэба гэта рабіць шляхам самаасьветы. Вось-жа тут якраз можам адцеміць прыгожы паступак рэдакцыі беларускага гаспадарскага часапісу „Самапомач," якая, хочучы памагчы беларускай моладзі паглыбляць сваю веду з земляробскай гаспадаркі, пастанавіла дарма раздаць частку гадавікоў „Самапомачы" за мінулыя гады тым, хто аплаціць да 1.XII. сёл. падпіску за „Самапомач" за 1937 год і прышле 1 зл. на пакрыцьцё коштаў перасылкі гадавікоў. Рассылацца гадавікі „Самапомачы" будуць за такія гады: 1933, 1934, 1935 і 1936.

Дык хто вышле на адрыс Рэд. „Самапомачы" — Вільня, Завальная 1, падпіску на 1937 год — 3 зл. і 1 зл. на перасылку гадавікоў, г. зн. разам 4 зл., той атрымае ўсе нумары „Самапомачы" за 1937 год і **два гадавікі** за мінулыя гады гэтага часапісу, якія сабе выбера. Трэба зазначыць пры тым, што кожны гадавік „Самапомачы" гэта самастойная гаспадарская чытанка, у якой можна знайсьці шмат цікавых і карысных радаў аб гаспадарцы палявой, сенажатнай, гадаўлянай, малачарскай, вэтэрынарнай помачы, аб хатняй гаспадарцы, жаноцкай і г. д.

Дык карыстайце з аказіі атрыманьня за невялікую аплату трох гадавікоў „Самапомачы!"

TAMAŠ MASARYK

14 vieraśnia siol. pa ŭsim śviecie razyjšłasia viestka ab śmierci vialikaha českaha patryjota, vučonaha, palityka i ŭrešcie prezydenta adrodžanaj Čechasłavaččyny, praf. D-ra Tamaša Masaryka.

Nie ab śmierci adnak chočacca tut havaryć — bo mruć ludzi štodzień — ale ab žyćci j zmahańniach hetaha vialikaha j zasłužanaha čałavieka, jaki pracaj svajej zapiarečyŭ rymskuju zasadu, što „nichto nia jość prarokam u svajej baćkaŭščynie". T. Masaryk takim „prarokam" patrapiŭ być za žyćcia; a pa śmierci jon pakaryŭ sabie sercy nia tolki svajho narodu, ale i ŭsiaho cyvilizavanaha śvietu. Moža nia raz chto mała viedaŭ ab Čechasłavaččynie, nia moh adnak nia viedać ab jejnym synie, T. Masaryku.


T. Masaryk — heta sapraŭdnaja vielič, heta siła, jakaja adnak nie znajšłasia sama saboj, ale vyrasła ŭ ciažkich zmahańniach z žyćciom. Dziela hetaha varta choć ŭ najhrubšych tolki rysach praśledzić kalainy žyćcia T. Masaryka.

Radziŭsia M. Masaryk u 1850 h. ŭ Hodoninie (Morava), u siamji dvornaha furmana; matka-ž jahonaja była ŭ tym-ža dvare kucharkaj. Nie z dabra małady Tamaš byŭ škiravany vučycca za kavala. I vučyŭsia. Vypadak adnak vyrvaŭ Tamaša M. ŭ Vienu, stalicu tahačasnaj Aŭstra-Vuhorskaj imperyi. I tut T. Masaryk samatuham zdabyvaje siaredniuju aśvietu (himnaziju), a paśla j vyšejšuju — na filozofičnym addziele Vienskaha universytetu. Mieŭ tady ŭsiaho 22 hady i ŭładaŭ užo 10-ciu jezykami. Dziela pašyreńnia viedy vyjechaŭ u Lejpcyg (Niamieččyna), dzie ŭ 1878 h. j žaniŭsia z maładoj amerykankaj č. Garrig (Garrigue), proźvišča jakoj dadaŭ da svajho, nazyvajučysia ad hetaha času aficyjalna T. H. - Masaryk (= T. Garrig-Masaryk). Treba adciemić, što žonka (pachodziła z hugienotaŭskaha rodu) Masaryka mieła nie mały ŭpłyŭ na pohlady j pracu svajho muža, asabliva ŭ pytańni etyki, morali, relihii (T. Masaryk pakinuŭ katalictva j staŭsia protestantam) i navat palityki.

U 1879 h. T. Masaryk staŭsia docentam filozofii na universytecie ŭ Vienie, a praz try hady (1882 h.) prafesaram socyjolohii ŭ nova adčynienym českim universytecie ŭ Prazie. I tut Masaryk znajšoŭsia, jak kažuć, na svaim miescy. Jon nie zamykaŭsia tolki da svajej pracy ŭ kabinecie navukoŭca i tamu chutka staŭsia ahulna cenienym pavadyrom moładzi. Ale hetaha było jamu mała, zaniaŭsia palitykaj i ad 1891 da 1907 h. byŭ pasłom u Vienskim parlamancie. Tut zasłyŭ T. Masaryk jak śmieły abaronca praŭdy, što nie zaŭsiody jšło ŭ pary z tahočasnymi nastrojami svajho sobskaha českaha hramadzianstva. Ale j tut Masaryk byŭ ćviordym i niaŭstupnym, a historyja pryznała za im praŭdu. Masaryk na peŭny čas pakinuŭ pasłavańnie, ale j na piadziu nie adstupiŭ ad svaich pierakanańniaŭ: hramiŭ fałšavańnie čechami-ž viedamych Kraledvorskich Rukapisaŭ, vystupiŭ adkryta j rašuča praciŭ antyžydoŭskaj nahonki (u viedamym sudovym pracesie Hilsnera — analohija Bejlisa —) i h. d.

Pryjšła vajna 1914 h. Masaryk razumieŭ, što bje hadzina vyzvaleńnia abo śmierci jahonaha narodu. I choć mieŭ užo 65 hadoŭ, to adnak pakinuŭ kraj, siamju j vyjechaŭ u Italiju, a stul u Švajcaryju, Francyju, Anhliju, Rasieju (krasavik 1917 h ; u carskuju-ž Rasieju Masaryk nia mieŭ prava pryjechać za svaje „praviny" prad

carom), u Ameryku. Padčas hetych biazkoncych padarožaŭ Masaryk pierakanaŭ tahočasnych kiraŭnikoŭ suśvietnaje palityki, što miru nia budzie datul, pakul isnu-



Tamaš Masaryk.

je Aŭstra-Vuhorskaja monarchija i pakul čechi j słavaki nie zdabuduć palityčnaje niezaležnaści. Abvieściŭ-ža śvietu Masaryk hetu niezaležnaść u viedamaj Vašyngtonskaj deklaracyi, z 18.X.1918 h. Viarnuŭsia ŭ kraj Masaryk 21.XII. 1918 h. paśla 4-chhadovaj niabytnaści (ad 18.XII.1914 h.) jak prezydent novaŭtvoranaj Čechasłavackaj respubliki.

Hetak zakončyŭsia etap vyzvolnaj baraćby; pačaŭsia etap budaŭnictva, nia mienš važny i nia mienš ščaślivy. Aŭtorytet zdabyty padčas vyzvolnych zmahańniaŭ Masaryk vykarystoŭvaŭ ciapier tolki na toje, kab ucichamiryć uzburanyja sprečki pamiž svaich-ža ludziej: levyja elementy*) mieli prava bačyć u Masaryku zaruku socyjalnych reformaŭ, usia-ž rešta bačyła ŭ im zaruku ładu j supakoju takoha, jaki byŭ zabiaśpiečany zakonami novaj respubliki.**)

Jak u vyzvolnym, tak i ŭ budaŭničym peryjadzie Masaryk astaŭsia viernym vyznavalnikam idei pacyfizmu i demakracyi, i heta ŭ apošniuju asabliva paru rezka vydzialała Masaryka spasiarod uzburanych chvalaŭ roznaje dyktatury i jašče bolš pryviazvała da jaho ludziej. Dokazam hetaha byŭ nadany jamu narodam nazoŭ „tatiček", a tak-ža try razy zaparam paŭtaranyja pieravybary (1920, 27 i 34 h.) Masaryka na stanovišča prezydenta respubliki.***)

Pa apošnich pieravybarach u 1934 h. siły T. Masaryka adnak vidavočna apadali i jon, čujučy i razumiejučy heta, uvosieni 1935 h. dabravolna i rašuča zroksia svajho zaščytnaha stanovišča, pakazvajučy na vučnia svajho, pryjaciela j pamacnika ŭ pracy D-ra E. Beneša. Narod-ža nazvaŭ jaho Prezydentam—Asvabadzicielam.

14 vieraśnia siol. pierastała naviekі bić heta šlachotnaje Serca.

Viestka ab śmierci Masaryka, choć i nia była niespadzieŭkaj, to adnak dziŭna hłybaka ŭzvarušyła **cely śviet.** Dokazam hetaha 10 tysiač žałobnych telehramaŭ i piśmaŭ i napłyŭ niaźličanych masaŭ ludziej na skromnyja pachoviny, na cichich viaskovych mohiłkach.

Jak usio heta charakterna dla sapraŭdy Vialikaha Čałavieka!

Ad. Klimovič.

*) českija soc.-demokraty byli vielmi blizkija da Masaryka, a lehalnaja ŭ Čechasłavaččynie kamunistyčnaja partyja ličyła Masaryka „niaškodnym humanistam".

**) „Krylatym" astaniecca na zaŭsiody adkaz prezydenta Masaryka delehacyi katalikoŭ, što „kataliki ŭ Čechasłavaččynie buduć mieć hetulki pravoŭ, kolki ich sabie advajujuć".

***) Čechasłavackaja kanstytucyja nie pazvalaje hetkich pieravybaraŭ, ale dla Masaryka zroblena była specyjalnaja ŭstupka. Z hetaha paŭstała navat svajho rodu lehienda, što Masaryk byŭ vybrany prezydentam da śmierci.

Biełarusy na pachovinach T. Masaryka

Z pryčyny śmierci Prezydenta-Asvabadziciela T. G.-Masaryka Biełaruski Nacyjanalny Kamitet u Vilni, jak ahulna-nacyjanalnaje pradstaŭnictva, vysłaŭ na piśmie spačuvańnie Českamu Narodu na ruki prezydenta D-ra E. Beneša.

Akramia taho piśmiennyja spačuvańni na ruki Ministra Zahraničnych Spraŭ Čechasłavaččyny praf. Krofty vysłała Biełaruskaja Rada ŭ Prazie, a na ruki Centralnaha Sajuzu Čechasłavackaha Studenctva — Abjednańnie Biełaruskich Studenckich Arhanizacyj.

Niezaležna ad hetaha asobnaja biełaruskaja delehacyja ŭ składzie: D-ra Jermačenki, Inž. Rusaka i D-ra Hryba złažyła na trunu łaŭravy vianok z šarfami ŭ biełaruska nacyjanalnych kolerach (biełčyrvona-bieły). Na šarfie byŭ česki nadpis, jaki pabiełarusku vyhladaŭ hetak: „T. G.-Masaryku — vučycielu humannaści i zmaharu za praŭdu — Biełarusy". Vianok hety byŭ złožany na trunie, kali jana była vystaŭlena dla publiki na Pražskim zamku. Usiaho viankoŭ było da troch tysiač, a biełaruski vianok lažaŭ u pieršym radzie, druhi z spravaj starany.

Hetak Biełarusy razłučylisia z T. Masarykam, jaki cełaje žyćcio svajo paśviaciŭ zmahańniu za pravy niedziaržaŭnych narodaŭ.

Заданьні беларускай моладзі ў Латвіі

Пасьля закрыцьця беларускіх арганізацыяў і Саюзу Беларускае Моладзі ў Латвіі, перад беларускай моладзьдзю паўстае пытаньне: як дапасавацца да новых варункаў, як найлепш скарыстаць тыя магчымасьці, якія яшчэ ёсьць.

Размах працы, зразумела, вельмі сьцісьнены, старыя мэтоды працы і змаганьня сталі немагчымымі. Гэта выклікала дзе-ні-дзе настрой адмовы ад працы сярод моладзі. Аднак мы павінны працаваць і знайсьці новыя мэтады нашай працы.

Вось-жа трэба перадусім арганізаваць гурткі вучобы, самаасьветы, бо бяз веды няма змаганьня, а без змаганьня ня будзе перамогі. Мы ня можам зыходзіць з нівы змаганьня і ня бачыць тых заданьняў, якія стаяць перад намі. Калі раней існавалі гурткі сялян па 20—40 чалавек, калі і цяпер некаторыя гурткі просяць кніжак, газэт ці проста сьвядомага чалавека, дык трэба ім гэта даць. Адзін дзень праведзены сярод беларускіх сялян і работнікаў дае маладому беларускаму змагару больш, чым некалькі тэорэтычных „дакладаў."

Хай гурток такі выдасьць лістоўку, хоць і рукапісную, матэр'ялу для якой хоць адбаўляй, хай чытае яе сваім знаёмым, тлумача і г. д. Кожны з нас павінен быць працаўніком на роднай ніве.

Трэба выйсьці на ўсе шляхі Бацькаўшчыны. На кожным завароце, на кожным раздарожжы павінна гучэць вольнае і сьмелае слова Беларуса. Поўнаю жменяю трэба кідаць у масу жыхарства краю беларускія зярняткі сьвядомасьці, хоць мы і ня ўбачым адразу руні, хоць і ведаць ня будзем, ці зярняткі зваліліся на зямлю, ці панёс іх вíхор. Вынікі нашай працы мы ўбачым пасьля.

Дык, браты, усе разам у гурткі вучобы і змаганьня з няволяю цемры.

Латвія.

Вольнавец.

„Radyjo dla miesta i vioski"

Pad hetkim nazovam, z pryčyny 10-cihodzia isnavańnia Vilenskaje Radyjostancyi, ad 15 da 30 vieraśnia sioleta ŭ Vilni adbyłasia radyjovaja vystaŭka. Ładžanaja jana była dziela taho, kab jašče bolš pryčynicca da pašyreńnia radyja ŭ mieście i na vioscy. Treba adnak skazać, što vystaŭka, choć na jaje pryvozili ludziej navat z dalokich staron i mocna reklamavali, pradstaŭlałasia słabieńka i adnastaronna. Na vystaŭcy byli aparaty pieravažna samyja darahija. Najtańniejšy aparat lampkovy kaštavaŭ 290 zł., i pry tym najčaściej aparaty henyja možna stavić tam, dzie jość elektryčnaść. Jasna, takija aparaty moža kuplać tolki mieščanin i to bahaty, a nikoli zhaleŭšaje sialanstva. Heta maleńkaja zaŭvaha havoryć ab tym, što faktyčna Vilenskaja Radyjostancyja na viosku zvaročvała i zvaročvaje vielmi małuju ŭvahu, i choć apošnim časam byccam robiacca natuhi, kab radyjo zbližyć da vioski, to adnak vidać, što i hetyja natuhi nia jduć u pary z vioskaj, z našym sialanstvam.

Nia budziem hałasłoŭnymi. Prad saboj majem prahramu vasieńnie-zimovaha sezonu 1937-38 hodu nadrukavanuju ŭ adnadnioŭcy „10 lat rozgłośni Wileńskiej" i ŭ jej nie znachodzim nidzie ani słoŭca ab tym, kab choć čas-adčasu była aŭdycyja (radyjovaja pieradača) ŭ zrazumiełaj dla našaha sialanstva i jaho rodnaj biełaruskaj movie. I ŭ hetaj-ža samaj adnadnioŭcy znachodzim, miž inšym, ćvierdžańnie, što byccam Vilenskaja Radyjostancyja choča zadavalać patreby ŭsich žycharoŭ našaha kraju, dy pryjazna supracoŭničać z hramadzianstvam... — Dzie-ž tady lohika?.. — Vilenskaja Radyjostancyja, nie nadajučy biełaruskich audycyjaŭ, faktyčna adkidaje patreby najbolšaj častki žycharaŭ našaha kraju. Dy nia tolki adkidaje, ale nadajučy hutarki Ciotki Albinovaj u žarhonie, jaki maje reprezentavać hutarku našaha sialanstva, abražaje kožnaha biełarusa. I biełaruski sielanin, a tym bolš intelihient, čujučy hetkija i im padobnyja aŭdycyi, z ahidaj ad ich advaročvajecca, jak ad naśmieški nad im.

A što-ž tady dziejecca? — Tady sielanin z łapčyvaściu šukaje Miensku, šukaje taje radyjostancyi, dzie nadajuć aŭdycyi ŭ zrazumiełaj dla jaho movie, pabiełarusku, ŭ tonie pavažnym, a razam, jasna, hłytaje ŭmieła padanuju balšavikami kamunistyčnuju prapahandu. U vyniku hetaha, jak piša naš karespandent, na vioscy navat u Vilenska-Trockim paviecie, pad bokam Vilenskaje Radyjostancyi, moładź piaje „častuški" — prypieŭki ab... Stalinie... Navučyłasia ich z radyja...

Voś-ža, kali Vilenskaj Radyjostancyi sapraŭdy zaležyć na tym, kab jaje aŭdycyjaŭ słuchali ŭsie žychary našaha kraju, kab žyć z imi ŭ zhodzie i zadavolivać ichnija kulturnyja patreby, pavinna jana nieadkładna ŭ svaju prahramu ŭviaści biełaruskija aŭdycyi: biełaruskija lekcyi, biełaruskija pieśni, muzyku, hutarki i h. d. Adnačasna treba spynić tyja aŭdycyi, katoryja aśmiešajuć tolki žycharoŭ našaha kraju, pradstaŭlajučy jaho jak niešta nižejšaje, mała kulturnaje, biez svajho sapraŭdnaha abličča. Dumaju, što hetkija patreby ŭ prahramie Vilenskaje Radyjostancyi para ŭžo razumieć nia tolki biełarusam, ale i ŭsim inšym žycharom hetaha kraju, a pieradusim kiraŭnictvu radyja.

J. N.



Памажэмо сваей моладзі!

Стаўся факт даўно ў нас нябывалы. Ужо колькі год запарам беларуская вёска жыла замкнёным у сабе жыцьцём і змучаная доўгім крызысам думала толькі аб тым, як „стачыць канцы з канцамі". Адукаваньне сялянскіх дзяцей вышэй пачаткавай школы стала ўваччу нашага селяніна нейкім „збыткам", аб якім яму ня можна й думаць.

І пры гэткіх вось варунках сёлета раптам газэты прынясьлі вестку, што наплыў дзяцей у Беларускую Філію Дзяржаўнае Гімназіі ім. Юл. Славацкага ў Вільні быў так вялікі, што школа змагла прыняць толькі палову (з 84-ох толькі 43!) тых, якія папрыяжджалі і паздавалі ўступныя экзаміны. Дагэтуляшнія стараньні беларускіх бацькоў пашырыць школу, дадаючы роўналежную 1-шую клясу, а таксама павялічыць інтэрнат — не далі пажаданых рэзультатаў. Няпрынятыя ў школу дзеці мусілі вяртацца дамоў з нічым.

Гэта факт і радасны і сумны адначасна. Радасны, бо вёска наша прачхнулася со сну і горнецца да асьветы, і сумны — бо да гэтай асьветы яна дабіцца ня можа.

Усё гэта ня можна пакінуць і далей свайму толькі лёсу. На гэта трэба зьвярнуць увагу і падаць руку тым, хто самі сабой, паміма найлепшай ахвоты даць рады сабе ня могуць.

Нам патрэбна свая інтэлігенцыя. Гэтую праўду мусіць зразумець кожны беларус. Тут ніякіх аднекваньняў ня можа быць. Ня можна дапусьціць, каб паступіўшыя вучні ці новапаступаючыя і старшыя студэнты, з прычыны дрэнных матарыяльны варункаў безрэзультатна варочаліся дамоў. Трэба неадкладна стварыць **фонд незаможнага беларускага студэнта і вучня!** З гэтым скромным заданьнем можам справіцца. Толькі трэба дзеяць энэргічна. Няхай кожны сьведамы Беларус сам унясе складку і другіх заахвоціць.

Жыды з дабравольных ахвяр ствараюць вялікія фонды. Чаму-ж мы Беларусы ня можам у іх гэтага павучыцца і стварыць свой фонд, каторы павялічыў-бы рады маладой беларускай інтэлігенцыі? Можам і мусім! Спосаб карыстаньня з гэтага фонду трэба ўнармаваць адумысным рэгулямінам, які няхай уложаць самі ахвярадаўцы на супольным сходзе.

* * *

Мы фактычна ўжо ня раз заклікалі беларускае грамадзянства разгарнуць справу дапамогі беларускай вучнёўскай моладзі і заўсёды гэту справу прыймалі шчыра да сэрца, ды рабілі што было ў нашых сілах. У мінулых гадох усей дошой падтрымлівалі існуючую пры Беларускім Нацыянальным Камітэце Камісію Дапамогі Беларускай Студэнцкай Моладзі, якая шмат папрацавала, каб асягнуць тыя мэты, дзеля якіх паклікана, і якая шмат каму з моладзі памагла. Як даведываемся, сёлета Камісія Помачы Бел. Студ. Моладзі пры Б.Н.К. перастала існаваць з прычын незалежных ад Камісіі. Справу дапамогі нашай моладзі аднак трэба прадаўжаць. Яна ёсьць палючай, канешнай, маючай вялікае грамадзкае і нацыянальнае значэньне. Ходзіць толькі аб арганізацыйна-фармальны бок. Трэба гэтую акцыю ўлажыць у праўна-фармальныя рамкі. Панашаму гэтых рамкаў ня трэба шукаць новых. Ёсьць старыя. Маем на думцы Стыпэндыяльны Фонд пры Беларускай Крэдыт-

най Коопэратыве (раней Банку) у Вільні. Вось-жа найлепш было-б гэты існуючы фармальна і праўна фонд узмоцніць, зрабіць яго дзейным. Ажывіцца-ж ягоная дзейнасьць, калі беларускае грамадзянства запраўды шчыра аднясецца да акцыі дапамогі беларускай моладзі і будзе прысылаць грошы.

Няхай-жа наш заклік дапамогі беларускай моладзі, а перадусім заклік Беларускага Нацыянальнага Камітэту, які друкуем, а таксама заклік бел. паэта Максіма Танка ў „Бел. Летапісе“ (№ 9 за 1937 г.) ня будуць пустымі словамі, няхай знойдуць гарачы водгук у кожным беларускім ахвярным сэрцы! Дык усе на дапамогу сваей моладзі.

Ахвяры можна прысылаць і на адрыс рэд. „Шляху Моладзі“: Вільня, Завальная 1.

Ад сябе рэд. „Шляху Моладзі“ ахвяроўвае на акцыю дапамогі студэнтам 10 зл.

У якіх варунках працуе Беларуская Гімназія ў Вільні.

„Бел. Летапіс“ у № 9 сёлета' у артыкуле „На парозе школьнага году“, сьцьвердзіўшы вялікі наплыў вучняў у першую клясу Беларускае Гімназіі ў Вільні, гэтак піша:

„Пры нармальных умовах у такіх выпадках школа дастае права на арганізацыю роўналежнае клясы, а тут ня можна будзе павялічыць лік вучняў у І-й клясе нават да 50 чалавек, бо Пэдагагічны Рэгулямін стаіць на перашкодзе. У другой клясе зусім няма вольных месц — там поўны камплект 46 асобаў, а ў 3-й клясе на адно вольнае мейсца здаюць экзамены чатыры кандыдаты.

Далей „Беларускі Летапіс“ у гэтым-жа артыкуле разглядае справу замены памешканьня Бел. Гімназіі (як мы ўжо пісалі гімназія перанесена сёлета з вул. Астрабрамскай 9, на вул. Дамініканскую 3/5) і так аб гэтым кажа:

Натуральна, пэдагагічныя прынцыпы абавязваюць усіх, хто апякуецца ўзгадаваньнем моладзі. Чаму іменна *беларускую гімназію спатрэбілася высяліць з адпаведнага памешканьня ў неадпаведнае* у той час, калі не перанесена з таго самага будынку, напрыклад, Духоўная Сэмінарыя, якая мае толькі 3 клясы. Беларуская Гімназія фактычна распачынала 20-год існаваньня ў сваёй сядзібе пры Вострабрамскай вуліцы, мела ў сваім карыстаньні *14 адпаведных пакояў*, а на новым месцы атрымала толькі *12 неадпаведных і напалавіну меншых*.

Прылады і мэбэль фізычнага кабінету ледве пастаўлены ў цесным пакоі. Зусім неадпаведнае месца для прыродазнаўчага кабінэту і няма гімнастычнай залі. Канцэлярыя гімназіі месьціцца ў цесным заканурку каля самай уборнай. Клясы Гімназіі будуць параскіданы на 1-м і аж на 3-м паверсе тады, калі ўвесь другі паверх адданы пад *прыватнае памешканьне* дырэктару польскай гімназіі. Дабро школы, выгады моладзі і цэлай пэдагагічнай карпарацыі пастаўлены ў залежнасьць ад выгад адзінкі. Вучні і прафэсары змушаны будуць мерыць халодныя сходы, абмінаючы прыватную кватэру. Такая арганізацыя школы, па-нашаму, ня зусім у згодзе з засадамі пэдагогікі і так моднымі цяпер прынцыпамі грамадзкага ўзгадаваньня“.

Увага зусім слушная.

ВОСЕНЬ

Цёмныя хмары паўзуць над зямлёю
Сьлёзы халодныя буйныя льюць,
Птушкі-пявункі сабраўшысь гурбою
Летніх сьпяванак ужо не пяюць...
З дрэваў пажоўклыя падаюць лісьці,
Неяк тужліва ад ветру шумяць,
Красак і кветак няма як калісьці,
Немай пустэчай глядзіць сенажаць...
Сном няпрыкметным пара пралятае
Шляхам бязконцым жыцьцё ў даль імкне;
Зноў туманы і цьма казкі сплятае,
Зноў шэрая восень стаіць ля вакна.

Мікалай Гараўнік.

ЗЕМЛЯРОБУ

Ты гары сваю зямельку
Рэж нарогам, брат, ральлю,
Каб гаротную сямейку
Ты прывёў к таму дабру...

Каб ня быць ужо бяз долі
Так далей, мой мілы брат,
Каб яна, на родным полі
Расьцьвітала на свой лад.

А. Гацура.

Памёр Барыс Клецкін

18-га верасьня сёлета ў Вільні памёр шырока ведамы выдавец Барыс Клецкін.

Радзіўся ён 5.V.1875 году ў м-ку Гарадзішча ў Наваградчыне. Паходзіў з багатае жыдоўскае сям'і, аднак з маладых дзён зблізіўся ён да работніцкіх кругоў і займаўся разпаўсюджваньнем літаратуры. Пасьля праз цэлае жыцьцё прыймаў чыннае ўчасьце ў грамадзкім жыцьці.

Атрымаўшы ў спадчыне па бацьках вялікія багацтвы, у 1911 годзе Б. К. сарганізаваў у Вільні ведамае сярод Жыдоў усяго сьвету „Віленскае Выдавецтва Б. Клецкіна". І тут ён выдаваў сотні тысячы кніжак пажыдоўску, а таксама літаратурныя часапісы, якія ў разьвіцьці жыдоўскае літаратуры мелі вялікае значэньне.

Б. Клецкін быў найвялікшым жыдоўскім выдаўцом, пры тым выдаваў ён кніжкі ня толькі жыдоўскія, але польскія і **беларускія.**

Беларускія кніжкі Б. Клецкін пачаў выдаваць у 1921 г. і выдаў іх больш 20. Між іншым выдаў ён: „Гісторыю Беларускае Літаратуры" і „Хрыстаматыю Беларускай Літаратуры"—М. Гарэцкага, „Геаграфію Беларусі" — А. Смоліча, „Вянок"—М. Багдановіча, „У Палескай глушы" і „У глыбі Палесься"—Тараса Гушчы, „Шляхам жыцьця"—Я. Купалы, „Беларуска-польскі слоўнік", „Беларускі правапіс", „Пад сінім небам"— Н. Арсеньневай і іншыя цэнныя беларускі кніжкі і школьныя падручнікі. Выданьні Б. Клецкіна салідныя і вельмі акуратныя.

Пералічаныя вышэй кніжкі сьведчаць аб тым, што Барыс Клецкін — Жыд — мае вялікія заслугі і перад Беларусамі. Імя ягонае ўпісалася ў беларускую літаратуру на заўсёды.

Няхай-жа тады лёгкай будзе Яму нашая зямелька!

Я—к.

Na pamiatnik Antonu Levickamu ŭ Vilni

achviaravali:

M. Kancelarčyk 1 zł., E. Budźko 2 zł., V. Bandarevič 1 zł., Moładź vioski Reŭki, Skidalskaj voł., Horadzienskaha pav. 1 zł. 50 hr., inž. M. Huzoŭski 2 zł., Dr. M. Hałubianka-Bučynskaja 10 zł. Prytycki Jan 1 złot.

Tych, što žadajuć, kab mahiła słaŭnaha biełaruskaha piśmieńnika i dziejača Antona Levickaha mieła naležny vyhlad i dahetul jašče nie złažyli svaje achviary, prosim heta zrabić jak najchutčej.

Usim achviaradaŭcam składajem ščyruju padziaku.

Red. Kalehija „Šlachu Moładzi."

З КРАЮ

Моладзь цікавіцца беларускімі кніжкамі і газэтамі.

Квасоўка каля Горадні. Моладзь наша што-раз больш цікавіцца беларускімі кніжкамі і газэтамі, а таксама роднай асьветай. Сьведчыць аб гэтым вялікае запатрэбаваньне ў нас на беларускі лемантар „Першыя зярняты" і беларускія часапісы „Шлях Моладзі," „Chryścijanskaja Dumka," і інш. Найгорш аднак, што часапісы даходзяць да нас вельмі неакуратна, дзесьці гінуць. *Каровапас.*

АД РЭДАКЦЫІ: У справе недаручаньня часапісаў падамо йзноў рэклямацыю ў Дырэкцыю Пошты, бо „Шлях Моладзі" усім падпішчыкам з п. Квасоўка высылаецца акуратна.

Мы пераможам!

в. Ятра, Пачапаўскай воласьці, Навградзкага павету. Цяжкая доля сялянства, але яшчэ цяжэйшая моладзі. Ня маем свае арганізацыі, ня маем сваіх газэт і часапісаў. Праўда, атрымоўваем „Шл. Моладзі" і „Летапіс," але ці-ж гэта можа задаволіць нас пасьля таго, як пару гадоў таму мы мелі сваю арганізацыю ТБШ і атрымоўвалі штотыдзень некалькі газэт, між іншымі і „Бел. Крыніцу." Ня гледзячы на цяжкае палажэньне, мы цьвёрда і ўпорна йдзём па цярністым шляху, які вядзе да лепшага заўтра...

На вечарынах, ці так у вольны час, моладзь пяе свае родныя беларускія песьні, дэклямуе вершы нашых слаўных песьняроў: Коласа, Купалы, Танка і інш. Кожны з ахвотай вучыцца пабеларуску пісаць і чытаць (у школе у нас, як і ўсюды, навучаюць дзяцей толькі папольску), толькі шкода, што ня маем адпаведных падручнікаў, напр. адным лемантаром „Першыя Зярняткі" прыходзіцца карыстаць аж 10 асобам. Але нічога, мы пераможам ўсё!.. *Каліна.*

Piajuć „častuški" ab Stalinie.

Šumsk, Vilenska-Trockaha pavietu. Narod i moładź pačynajuć štoraz bolš cikavicca kulturaj i svajej rodnaj biełaruskaj litaraturaj i pieśniaj. Śviedamaść nacyjanalnaja pašyrajecca. Sialanie achvotna słuchajuć radyja, nie razumiejučy adnak čužoj movy, „łoviać" Miensk, skul havorać i piajuć pabiełarusku. Słuchańnie mienskaha radyja pryčyniajecca adnak mocna da pašyreńnia kamunistyčnaj prapahandy i dachodzić navat da taho što moładź piaje kamunistyčnyja častuški ab Stalinie.

Dziŭna sapraŭdy, čamu heta Vilenskaje Radyjo ničoha nie nadaje pabiełarusku?

Radyjosłuchač.

ХРОНІКА

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

— Рада Б.Н.Р. Гэтымі днямі адбылося паседжаньне Прэзыдыюму Цэнтральнага Камітэту Беларускага Народнага Аб'еднаньня, на якім разглядаліся, між іншым і справы палітычныя. Дзеля вырашэньня некаторых справаў пастаноўлена склікаць Раду Б.Н.Р.

— Памятнік Цётцы. Памятнік ведамай беларускай паэтцы-рэвалюцыянэрцы Цётцы ўжо гатовы і пастаўлены на яе магіле ў Старым Двары, Шчучынскага пав. Памятнік паставіла паэтцы ейная сястра грам. Сапоцьчыха.

— Японцы цікавяцца Беларусамі. У мінулым тыдні ў Вільні адведаў беларускія ўстановы і рэдакцыі некаторых беларускіх газэт японскі дыплёмат, цікавячыся беларускай мінуўшчынай і сучасным беларускім народным рухам.

— Яшчэ суд за „Бел. Крыніцу". Нядаўна Пракуратура ўручыла акт абвінавачаньня рэдактару „Б. Крыніцы" Ад. Дасюкевічу і выдаўцу Альф. Шутовічу. Вінавацяцца яны за артыкул „Сіла Ідэалу," зьмешчаны ў № 2 „Бел. Крыніцы" з дня 25.III.37.

— Немцы купілі шмат беларускіх кніжак. Нядаўна Бэрлінскі Загранічны Інстытут, які арганізуе Беларускі Аддзел, закупіў у Вільні значны лік беларускіх кніжак.

— Сьмерць Ад. Зянюка. 23.IX сёл. памёр у Вільні на 43 годзе Ад. Зянюк. Нябожчык за часоў студэнцкіх прыймаў учасьце у беларускім жыцьці. Па сканчэньні Віленскага Унівэрсытэту працаваў як судзьдзя ў Століне (Палесьсе) і пасьля аж у Сандоміры.

— Падвышылі плату. Даведваемся, што ў інтарнаце „Зем Пулноцно-Всходніх" у Вільні, вучням з Беларускай Гімназіі падвышылі плату. — Гэта яшчэ адзін доказ, што трэба зараз-жа арганізаваць беларускія інтэрнаты.

— З дзейнасьці Беларускага Крэдытнага Коопэратыву ў Вільні. 28-га верасьня адбылося паседжаньне Управы Беларускага Крэдытнага Коопэратыву ў Вільні (Каралеўская 3—8), на якім пастаноўлена узмоцніць дзейнасьць у кірунку сьцягіваньня у даўжнікоў залеглых працэнтаў і капіталавага доўгу, а супроць злосных даўжнікоў — перадаць справы ў суд. З даручэньня Коопэратыву і ад імя яго вядзець гэтыя справы адзін з віленскіх адвакатаў, які ўжо распачаў крокі супроць многіх даўжнікоў. На гэтым-жа паседжаньні пастаноўлена ўзмоцніць дзейнасьць існуючага пры Коопэратыве стыпэндыяльнага фонду дапамогі беларускай вучнёўскай і студэнцкай моладзі.

—о—

— Арышт старшыні ўраду Б. С. С. Р. Старшыня ўраду Савецкай Беларусі Ваўковіч, які на гэта становішча назначаны толькі якіх два месяцы, нядаўна арыштаваны. Прычыны арышту, як падаюць савецкія газэты, нацыяналізм і выступленьні процiў маскоўскай цэнтралізацыі. Як бачым, „чысьцяць" ужо тых, што мелі быць „чыстымі"...

—о—

— Памёрла Грам. П. Захарчыха. На далёкай чужыне, на эміграцыі ў Празе Чэскай, 11.VIII.37 памерла Грам. П. Захарчыха, жонка намесьніка Старшыні Рады Беларускае Народнае Рэспублікі. Грам. В. Захарцы засылаем шчырыя словы спачуцьця.

З студэнцкага жыцьця

— АБСА на XIX Кангрэсе CIE. XIX-ты Кангрэс Міжнароднай Студэнцкай Конфэдарацыі (CIE) адбываўся сёлета 6—19 жніўня ў Парыжы. Беларускае студэнцтва ёсьць сябрам гэтае Конфэдэрацый праз сваю цэнтралю АБСА (Аб'еднаньне Беларускіх Студэнцкіх Арганізацый ў Празе Чэскай). Вотжа гэта АБСА на сёлетні кангрэс выслала дэлегацыю ў складзе: Ян Ермачэнка, В. Ермачэнка, Л. Красkоўская, М. Абрамчык і Л. Рыдлеўскі. Дэлегацыя здала Кангрэсу справаздачу з сваее дзейнасьці за мінулы год і акрамя таго зазнаёміла ўсіх прысутных з палажэньнем і патрэбамі беларускага студэнцтва пры помачы спэцыяльнага бюлетыну выданага пафранцуску.

З прысутнасьці на Кангрэсе беларускае дэлегацыі былі вельмі нездаволены дэлегаты—палякі, цьвердзячы, што яны—палякі маюць прадстаўніцтва і беларускага студэнцтва з Польшчы, хоць не маглі назваць ніводнага сябру свае дэлегацыі, які быў-бы беларусам.

Ня ласкавы на Беларусаў былі й студэнты савецкія, якія сёлета былі на Кангрэсе ў характары „наглядчыкаў".— У кожным разе для Беларусаў на форуме CIE ня выключаны ніякія „неспадзеўкі" як з боку палякоў, так і з боку бальшавікоў. Беларусы да гэтага павінны прыгатоўвацца ўжо цяпер.

Наступны Кангрэс CIE ў 1938 годзе адбудзецца ў Афінах, у Грэцыі.

U SIAČYNA

— 26.IX sioleta ŭ Varšavie adbyŭsia źjezd moładzi Polskaj Partyi Sacyjalistaŭ. Orhan hetaj moładzi — čas. „Młodzi idą" ŭ № 10 (26), miž inšym damahajecca dla nacyjanalnych miešaściaŭ školaŭ, ale jakich školaŭ — polskich, ci ŭ rodnaj movie nac. mienšaściaŭ — nia skazana(?). Charakterna, što na źjeździe moładzi PPS (pieravažna rabotnickaj) byli pradstaŭniki arhanizacyi polskaje sialanskaje moładzi „Wici" i što źjezd heny nie abyjšoŭsia biez pravakacyi z boku fašystaŭ, jakija ŭ pachod pepeesaŭskaje moładzi kinuli bombu, ad katoraj było raniena 20 asob.

— 19 i 20 vieraśnia siol. ŭ Vilni adbylisia narady instruktaroŭ i kiraŭnikoŭ „Związku Młodej Wsi". Cikava adciemić, što pravadyr hetaj arhanizacyi pasoł Kaminski havaryŭ, što jany musiać zmahacca z OZN, tymčasam staršynia „Młodej Wsi", p. Gierat u Varšavie na kanhresie „M.W." svajej deklaracyjaj vyrazna chiliŭsia da OZN-u. Sekratar vil. addziełu „M.W." na hetaj-ža naradzie kazaŭ, što instruktarami i kiraŭnikami „Mł. Wsi" mohuc być tolki palaki i da taho haračyja patryjoty...

— U m-cy vieraśni sioleta ŭ Pinsku adbyłasia VI Uunijackaja Kanferencyja, u jakoj brała ŭdzieł pieravažna polskaje katalickaje duchavienstva. Byli i ukraincy. Biełarusy ahułam kanferencyi henyja ad niekalki ŭžo hod bajkatujuć. Adnak sioleta trapiła tudy paru biełarusaŭ z „ducham polskim", jakija, zabirajučy hołas u dyskusii, nie advažylisia navat havaryć pabiełarusku. Treba skazać, što unijackaja akcyja zacichaje i zamiraje, dokazam čaho jość miž inšym i toje, što ŭžo pierastaŭ vychodzić biełaruski unijacki časapis „Da Злучэньня", jaki vydavali Ajcy Jezuity.

— U pałovie vieraśnia ŭ Varšavie adbyŭsia XXI Mižnarodny Prociŭalkaholny Kanhres. Z biełarusaŭ braŭ u im udzieł viedamy naš dziejač, piśmieńnik, dochtar medycyny Stanisłaŭ Hrynkievič. Šyrej ab hetym kanhresie padamo ŭ nastupnym numary „Šlachu Moładzi".

— 12.IX siol. u Paryžy (Francyja) viedamy biełaruski spartoviec Jury Kiepiel, na vypieradkach łodkami na race Sekvanie zdabyŭ pieršaje miesca i tytuł mistra Sekvany. Treba zaznačyć, što i ŭ minułym hodzie tam-ža J. Kiepiel zaniaŭ tak-ža na hetkich vypieradkach pieršaje miesca. Vinšujem!..

— U suviazi z prociŭžydoŭskaj akcyjaj i asadnictvam polskich ramieśnikaŭ, u Vilenskim, Navahradzkim i Biełastockim vajavodztvach była delehacyja „Związku Rzemieślników Chrześcijańskich" z Paznania i daśledžvała mahčymaści asadnictva ŭ našym kraju. Adzin-ža z polskich bankaŭ u Varšavie abiacaŭ dać na hetkuju kolonizacyju vialikuju dapamohu. Viestka heta pajaśnieńniaŭ zdajeca nie patrabuje... I havaryć nia treba, chto pieradusim karystaje z antysemityzmu...

— Na Dalokim Uschodzie mima zaŭziataha adboju, Kitajcy nia mohuć vytrymać nastupu Japoncaŭ i adstupajuć, prosiačy pomačy ŭ SSSR.

— U Hišpanii baraćba daiej idzie biaz bolšych i važniejšych źmienaŭ.

— Dziela taho, što na Siarodziemnym mory na cyvilnyja karabli, pieravažna anhlijskija i savieckija, napadali „niaviedamyja" padvodnyja łodki i samaloty, u švajcarskaje miastečka Nion była sklikana mižnarodnaja kanferencyja 52-ch haspadarstvaŭ, na jakoj pastanoŭlena supolna baranicca ad patajomnaha voraha. U kanferencyi hetaj nie ŭziali ŭdziełu Italijancy i Niemcy, a francuskija i anhielskija vajennyja karabli i samaloty ŭžo vyjechali na Siarodziemnaje mora zavieści paradak i supakoj. Ahułam miž Francyjaj i Anhlijaj zaŭvažvajecca što-raz bolšaje zbližeńnie.

— 25.IX siol. Musolini pryjechaŭ u hości da Hitlera i prabyŭ ŭ Niamieččynie niekalki dzion. Pamiž imi adbyvalisia palityčnyja narady, jakija majuć zamacavać italijanska-niamiecki sajuz.

— Levanieŭskaha dahetul nie znajšli i na ślady jahonyja nie natrapili. Dziela hetaha dalejšyja pošuki buduć spynienyja. U časie pošukaŭ Levanieŭskaha zahinuŭ viedamy anhlijski padarožnik Wilkins.

— Hajle Selassi — karol Abisynii, jaki prabyvaje ciapier na čužynie ŭ Anhlii, źviarnuŭsia da ŭsich kiraŭnikoŭ chryścijanskich Kaściołaŭ i Cerkvaŭ z piśmom, u jakim, u imia chryścijanskich pryncypaŭ, prosić padtrymać jahony kraj Abisyniju i asudzić niačuvany teror i praśled, jaki zaviali Italijancy ŭ Abisynii.

— Statystyčnyja danyja ščviardžajuć što ŭ Eŭropie ludzi havorać 120 jazykami.

— Nasielnictva ŭ Francyi kožny dzień, z pryčyny małoha pryrostu, źmianšajecca na 200 asob.

— U Francyi zahinuŭ dzieś stary rasiejski carski hienerał-emihrant Miller. Hazety pišuć, što jaho ŭkrali savieckija ahienty i vyvieźli ŭ SSSR. Pamahaŭ ahientam byccam hien. Skoblin, taksama rasiejki emihrant.

— Z pryčyny ciopłaje vosieni šmat dzie začvili druhi raz drevy. Miž inšym u Vilni na Łukiškach začvili druhi raz kaštany.

— Niadaŭna ŭ Vienie (Aŭstryja) pamior Jazep Frank, katory vystupaŭ u cyrku i mieŭ tytuł „karala abžorstva". Źjadaŭ jon adrazu 5 kilo harochu, dźvie šynki i 4 kilo ryby, zapivajučy heta 10 litr. piva.

PRAKTYČNYJA RADY

Ježmo syruju kvašanuju kapustu. Na asnovie daŭžejšych došledaŭ śćvierdžana, što kvašanaja syraja kapusta vielmi dobra dzieić na ludzki arhanizm. Małočny kvas, a taksama chemičny skła:nik cholina, jakija znachodziacca ŭ kvašanaj kapuście, pry spažyvańni jaje ŭ dzień pa 1 funcie, uzmacniajuć, pierabudoŭvajuć arhanizm. Daŭžejšym spažyvańniem syroj kvašanaj kapusty možna vylečyć astmu, ramatuz i zapor žałudka. — Dyk pryhataŭlajma i ježma kvašanuju kapustu.

Jak ratavacca pry zatrućci hrybami. Letam, a asabliva ŭvosieni ludzi davoli časta jaduć hryby i davoli časta byvajuć vypadki zatrućcia imi. Vypadki hetyja nia raz byvajuć ciažkimi, kali ludzi nia majuć naležnaj pomačy. Voś-ža, kali spaścieražem prykmiety zatrućcia, katoryja abjaŭlajucca ŭ silnych cialesnych bolach, korčach, razvalnieńni i nervovych vodruchach, treba chvoramu zaraz dać na vanity i na pračyščeńnie. Paśla pračyščeńnia treba što 15—20 minut davać pa stałovaj łyžcy taninu raspuščanuju ŭ vadzie (na šklanku vady ŭsypać łyžku taniny). Možna taksama davać pić napar z harbaty, abo z dubovaj kary. Biazumoŭna treba paklikać lekara. Dla chutčejšaj aryjentacyi lekaru ŭ chvarobie treba pakazać vanity chvoraha.

PAŠTOVAJA SKRYNKA

Radyjosłuchaču: Karespandencyju atrymali, drukujem i prosim pisać.

Płuhu: Karespandencyju nadrukujem i čakajem na abiacany artykuł.

Р. Б.: Артыкул атрымалі, дзякуем, зьмесьцім у наступным нумары. Раней прысланыя матарыялы таксама будзем выкарыстываць, як толькі будзе кðыху вальней з месцам.

Al. Papłaŭskamu: Mataryjały atrymali, dziakujem, budziem staracca vykarystać.

V. Kažemiacy: „Šl. M." vysyłajem Vam akuratna, što Vy nie atrymlivajecie heta—nia naša vina, a pošty, i hetuju spravu pieradajom paštovaj dyrekcyi.

Я. В.: Пісьмо перадалі. Прэміі будуць разьдзелены шляхам лёсаваньня ў лістападзе месяцы сёлета.

Новік А.: Атрыманыя вершы ў меру магчымасьці будзем друкаваць. Радзім пазнаць лепш беларускую граматыку і правапіс, і просім выразьней пісаць.

А. Гацуры: Вершы атрымалі і адзін з іх паправіўшы друкуем. „Песьня" напісана нішто-сабе, толькі што вельмі пэсымістычная. Больш жыцьця, бадзёрасьці, а менш сьлёзаў. Пісаць можаце, трэба толькі больш чытаць і прыглядацца да тых формаў якімі іншыя пішуць, а пасьля тварыць самому.

Каліне: Карэспандэнцыю ахвотна друкуем і просім пісаць часьцей.

Колі Гараўніку: Адзін з атрыманых вершаў, як бачыце, паправіўшы друкуем, рэшта слабыя. Радзім больш чытаць і працаваць над сабой. Імя Коля пахне расейшчынай, дык замяняем яго на Мікалай.

Каровапасу: Грошы атрымалі, дзякуем, кніжкі выслалі. карэспандэнцыю друкуем.

Грам. Юраму Саб—скаму: Паквітаваньне атрыманае ад Вас ахвяры на памятнік А. Лявіцкаму надрукана ў № 6 (105) „Шляху Моладзі", на бачыне 20, радок 23 зьверху.

Krychu śmiechu.

„Vajujučy" biazbožnik.

(Viestka pavažnaja, ale ŭ kutok śmiechu padchodzić).

Saviecki časapis „Гудок" u №1 57 paviedamlaje: „Niedaŭna na stancyi Nikoła-Połoma paŭnočnaj čyhunki pačali šukać u niejkaj spravie staršyniu miascovaha addziełu „Sajuzu Vajujučych Biazbožnikaŭ". Akazałasia, što staršynia ŭ carkvie... pryčaščaŭsia"...

Achviarny škot.

U adnej śviatyni ŭ Anhlii pastar vielmi mocna zaklikaŭ da achviarnaści, a paśla pačaŭ źbirać achviary. Adzin z škotaŭ, uzrušany pryhožymi słavami, kinuŭ prachadziačamu z skarbonkaj pastaru 2 manety. Bačačy heta druhi škot padyjšoŭ da pastara i šarpnuŭ jamu;

— Ja z hetym panam siudy razam pryjšoŭ.

Часапіс рэдагуе Рэдакцыйная Калегія.

Друкуецца ў Беларускай Друкарні ім. Фр. Скарыны ў Вільні (Завальная 1-2) коштам працы: Я. Багдановіча, Я. Найдзюка і А. Шутовіча.

Выдавец: „БЕЛПРЭС". Рэдактар Я. НАЙДЗЮК